**123.** Прачытайце. Формы якога назоўніка ёсць у прыказках? Пастаўце да іх пытанні ад выдзеленых слоў.

1. Хараство прыглядзіцца, а розум **спатрэбіцца**. 2. Сустракаюць па адзенні, а **праводзяць** па розуме. 3. Мудры свайго розуму **не паказвае**. 4. Чужым розумам **не пражывеш**. 5. І жывёла розум **ма́е**, дарма што не гаворыць.

У сказе назоўнікі звязваюцца з іншымі словамі і змяняюць сваю форму. Яны могуць адказваць на пытанні х т о? ш т о? к а г о? к а м у? к і м? і іншыя:

*спатрэбіцца* (ш т о?) ***розум***;
*не паказвае* (ч а г о?) ***розуму***;
*дзівіўся* (ч а м у?) ***розуму***;
*мае* (ш т о?) ***розум***;
*не пражывеш* (ч ы м?) ***розумам***;
*праводзяць* (п а ч ы м?) ***па розуме***.

**124.** Падбярыце блізкія па значэнні спалучэнні слоў па ўзоры. Па стрэлках пастаўце пытанні да назоўнікаў.

*любіць прыроду* — *любоў да прыроды*

цікавіцца кнігай — цікавасць … …

спачуваць бабулі — спачуванне … …



Правообладатель Национальный институт образования

**125.** Прачытайце верш. Назоўнік у дужках пастаўце ў патрэбнай форме.

Склалі песеньку мы самі.
Наша **песенька** пра *(мама)*.
*(Мама)* песню **заспявае,**
сум адразу прападае.
*(Мама)* **можа** ўсё на свеце,
з *(мама)* **добра** яе дзецям.
*І. Муравейка.*

**сум** — смутак, маркота (*рус.* грусть)

Спішыце, раскрываючы дужкі. Ад выдзеленых слоў пастаўце пытанні да назоўніка *мама*. Над рознымі формамі гэтага назоўніка запішыце пытанні, на якія яны адказваюць. Абазначце канчаткі назоўніка *мама*.

**126.** Спішыце. Дапоўніце сказы назоўнікам *рабіна* ў патрэбнай форме.

Каля нашага дома **расце** ... . Гэту ... **пасадзіў** мой дзядуля. Вясной ... **упрыгожваюць** белыя кветкі. Летам пад ... **можна схавацца** ад сонца. Восенню на ... **чырванеюць** ягады. Зімой птушкі **прылятаюць** на ... паласавацца імі.

Ад выдзеленых слоў вусна пастаўце пытанні да назоўніка *рабіна*. Абазначце канчаткі ў розных формах гэтага назоўніка.


Правообладатель Национальный институт образования

**127.** Прачытайце тэкст. Назоўнік у дужках пастаўце ў патрэбнай форме. Як грыбнік дапамог мухамору? Як грыб падзякаваў чалавеку?



На ўскрайку лесу **вырас** вялікі *(мухамор)*. Над *(мухамор)* **тырчала** сухая галінка сасны. Грыб упіраўся ў яе шапкай. Галінка **перашкаджала** *(мухамор)*.

Я **прысеў** перад *(мухамор)* і зламаў яе. Грыб вызваліўся, хіснуўся ўбок. **Пад** шырокай **шапкай** *(мухамор)* я ўбачыў крамя́ны баравік. *(Паводле В. Хомчанкі.)*

**крамя́ны** — пругкі, моцны

Выпішыце з тэксту сказы, у якіх ёсць назоўнік *мухамор*. Ад выдзеленых слоў вусна пастаўце пытанні да яго. Абазначце канчаткі ў розных формах гэтага назоўніка. Падкрэсліце прыназоўнікі, з якімі ўжываецца слова *мухамор*.

**Будзьце ўважлівыя!**

ву́лей *(адз. л.)* — вуллі́ *(мн. л.)*
вылецелі з вулля́, вылецелі з ву́лея,
шмат вуллёў



Правообладатель Национальный институт образования

**128.** Дапоўніце народныя прыкметы слоўнікавым словам у патрэбнай форме. Ад выдзеленых слоў вусна пастаўце пытанні да слоўнікавага слова.

Калі ўлетку дождж рэдка бывае, то ў  мёд **прыбывае.**

Пчолы **не вылазяць** з  — на туман.

Ранні **вылет** пчол з  — да ранняй і цёплай вясны.

Запішыце адзін сказ на выбар. Падкрэсліце прыназоўнік, з якім ужываецца слова *вулей*.

**ву́лей**

**129.** Дапоўніце скорагаворку слоўнікавым словам у патрэбнай форме. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.



Пчала чапялою чмяля
пачала выганяць з … .
Чмель ёй кажа:
— Пачакайце!
Пачастунку — мёду — дайце!
А пчала не частавала —
прэч з …
чмяля прагнала.

*П. Саковіч.*

Запішыце па памяці першы сказ. Падкрэсліце назоўнікі, вызначце іх род, абазначце канчаткі.


Правообладатель Национальный институт образования

Рм **130.** Прачытайце прыказкі. Якая з іх падказвае, што кожны павінен працаваць, а якая — што ў калектыве любую справу рабіць лягчэй?

Малая пчолка, ды і тая працуе.
За пчолкаю — у мёд, за жуком — у бруд.
Пчолкі па адной не селяцца.

**бруд** — гразь

Вызначце лік назоўніка *пчолка* ў сказах.

**131.** Прачытайце. Назоўнік у дужках пастаўце ў патрэбнай форме. Ад выдзеленых слоў вусна пастаўце пытанні да яго.

## Ку́хары

З Вовам *(каша)* мы **варылі** —
кацялок перакулілі.
І маркотна Вова кажа:
— Ой, як **шко́да** смачнай *(каша)*!
Засталося мала круп...
Замест *(каша)* **зварым** суп!

*Я. Крупенька.*

Спішыце, раскрываючы дужкі. Абазначце канчаткі ў розных формах назоўніка *каша*.

**шко́да** — шкада́ (*рус.* жаль)



Правообладатель Национальный институт образования